*А. А. ТРУСАЎ*

# ЭСТЭТЫКА АРХІТЭКТУРЫ РЭГІЯНАЛЬНЫХ МУЗЕЯЎ

*Значная частка беларускіх музеяў знаходзіцца ў прыстасаваных будынках, якія спачатку мелі зусім не музейныя функцыі. Аднак пачынаючы з XVIII ст. будаваліся і спецыяльныя музейныя будынкі, пра якія ідзе гаворка ў прыведзеным артыкуле. Аналіз эстэтыкі музейных будынкаў розных часоў сведчыць, што ў нашай краіне адсутнічаюць тыпавыя праекты рэгіянальных музейных будынкаў, а іх знешні выгляд мае выпадковы характар. Прычым некаторыя будынкі ці прыбудовы да іх будаваліся дзясяткі гадоў. З мэтай паляпшэння эстэтыкі знешняга выгляду музеяў і ўмоў захавання музейнага фонду аўтар прапануе распрацаваць і зацвердзіць некалькі розных тыпавых праектаў рэгіянальных музейных будынкаў, асабліва для краязнаўчых і мастацкіх музеяў.*

На пачатку 2008 г. сетка музеяў сістэмы Міністэрства культуры Беларусі складалася са 134 музеяў і 58 іх філіялаў, з якіх 14 маюць рэспубліканскае і 120 рэгіянальнае падпарадкаванне. Яны займаюць 310 будынкаў [9]. Таксама ў краіне працуюць каля 200 музеяў іншых ведамстваў і некалькі прыватных музеяў. Некаторыя з іх таксама займаюць асобныя будынкі. Аднак пэўнага пераліку музейных будынкаў у нашай краіне разам з фотафіксацыяй іх знешняга выгляду няма, як і няма тыпавых архітэктурных праектаў музейных будынкаў, асабліва рэгіянальных.

Справа яшчэ і ў тым, што музеі даволі часта па розных прычынах мянялі сваё месцазнаходжанне і пераходзілі з адных будынкаў у іншыя.

Пераважная частка беларускіх музеяў знаходзіцца ў прыстасаваных будынках, якія першапачаткова мелі зусім не музейныя функцыі. У XVIII–XIX стст. музеі знаходзіліся ў палацава-замкавых будынках і былі прыватныя. Таксама іх размяшчалі ў вучэбных карпусах розных навучальных устаноў альбо ў былых культавых памяшканнях. Тым не менш некаторыя выпадкі спецыяльнага музейнага будаўніцтва назіраліся і ў гэтыя часы.

У канцы XVIII ст. быў створаны музей у Полацкім езуіцкім калегіуме. У 1788 г. па праекце аўстрыйскага архітэктара Габрыэля Грубера да галоўнага будынка калегіума быў прыбудаваны корпус, дзе размясціліся навуковыя кабінеты і музей для выкладчыкаў і студэнтаў. Экспанаты займалі тры вялікія залы, прычым у адной з іх знаходзілася мастацкая галерэя. Аўтарам некаторых твораў быў сам Грубер [4, с. 56]. Захаваліся эскізы галерэй унутранага двара езуіцкага калегіума ў Полацку, якія датуюцца 1785 г. [10]. На іх мы бачым фрагмент велічнага будынка, аздобленага калонамі і пілястрамі карынфскага ордара. Ён мае тры паверхі з вялікімі вокнамі і прыгожымі каланадамі. Музей полацкіх езуітаў існаваў да 1820 г.

Аднак архітэктурны комплекс у стылі барока і ранняга класіцызму ацалеў і пасля доўгіх гадоў рэстаўрацыі 7 верасня 2002 г. у адным з карпусоў былога калегіуму была адкрыта пастаянная экспазіцыя мастацкай галерэі, складанай часткі Полацкага музея-запаведніка.

У 1840 г. у Горы-Горках Магілёўскай губерні была заснаваная земляробчая школа, якая праз восем гадоў стала сельскагаспадарчым інстытутам. У 1846 г. прафесар аграноміі Б. А. Цалінскі падрыхтаваў праект аб стварэнні пры школе музея сельскагаспадарчай прамысловасці. У 1847 г. праект быў зацверджаны, і за тры гады музей быў створаны [4, с. 62]. Ён знаходзіўся на другім паверсе галоўнага корпуса інстытута, помніка архітэктуры позняга класіцызму.

Пачынаючы з XVI ст. беларускія магнаты стваралі ў сваіх замках і палацах спецыяльныя пакоі, дзе захоўвалі і паказвалі знакамітым гасцям асабістыя ўнікальныя калекцыі. Так, у Нясвіжскім замку было спецыяльнае памяшканне, т. зв. «скарбец», дзе захоўваліся самыя каштоўныя рэчы. Існаваў таксама і «патаемны скарбец», пра які ведалі толькі гаспадары замка і іх даверанымя асобы.

Некаторыя беларускія магнаты будавалі ў сваіх маёнтках спецыяльныя музейныя павільёны. Багаты землеўласнік Адам Гюнтэр у маёнтку Дабраўляны Віленскай губерні ў 1824–1830 гг. па праекце архітэктара Яна Барэцці будуе новы палац і праводзіць рэканструкцыю старога парку ў стылі рамантызму. У цэнтры парка знаходзілася капліца з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

алтаром, унутры якога пад шклом былі раскладзены ўзоры зброі і археалагічныя знаходкі. Даследчык гісторыі музейнай справы Беларусі А. Гужалоўскі адзначае падабенства музейнага будынка Гюнтэра да памяшкання першага польскага музея «гатычнага дома» ў маёнтку Ізабэлы Чартарыйскай у мясцовасці Пулавы.

Спецыяльны музейны будынак у выглядзе двухпавярховага абарончага храма з чатырма вежамі па вуглах збудаваў у 1880 г. граф Эмерык Чапскі ў маёнтку Станькава Мінскай губерні. Прычым будынак музея быў злучаны падземнай галерэяй з асноўным корпусам палаца. Гэты будынак меў назву Скарбчык, што сведчыць пра шматвяковую музейную традыцыю ў Беларусі. Дарэчы, будынак прыватнага музея Чапскага захаваўся, але патрабуе неадкладнай рэстаўрацыі.

У XIX ст. у Беларусі пачынаюць з'яўляцца мемарыяльныя музеі. У 1857 г. Вандалін Пуслоўскі аднавіў дом Тадэвуша Касцюшкі ў маёнтку Мерачоўшчына і зрабіў там мемарыяльны пакой у гонар нашага славутага земляка. Марыя Жэброўская пры аднаўленні палаца Агінскага ў в. Залессе, захавала рабочы кабінет Міхаіла Агінскага, т. зв. «кампазітарскі пакой».

У 1913 г. паводле праекта архітэктараў В. І. Струева і І. Фаміна на тэрыторыі архірэйскага падвор'я быў збудаваны будынак Мінскага царкоўна-археалагічнага музея. Двухпавярховы будынак на высокім цокале зроблены ў стылях гістарызму і мадэрну. Таксама выкарыстаны элементы «псеўдарускага» стылю – цыбулепадобны купал над вуглавой вежай, а таксама двух- і трохлопасцевыя аркі і какошнікі. Рысы мадэрну – гэта асіметрычная кампазіцыя франтальнага фасада і некаторыя элементы аконных праёмаў [6].

Аднак музей існаваў у гэтым будынку нядоўга – да 1915 г. Было б добра зноў вярнуць будынку, у цэнтры Мінска, які нядрэнна захаваўся, першапачатковую функцыю.

Першая сусветная вайна, рэвалюцыя і польска-савецкая вайна нанеслі вялікі ўрон музейнай справе. У сакавіку 1921 г. тэрыторыя Беларусі была падзелена папалам. На тэрыторыі Заходняй Беларусі існавала некалькі значных музеяў, але знаходзіліся яны ў прыстасаваных будынках. У гэты час узнікаюць мемарыяльныя музеі, калі і будынак, і экспазіцыя складаюць адзіную культурную і эстэтычную каштоўнасць.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі да 1939 г. існавала тры мемарыяльных музея – музей А. Міцкевіча ў Навагрудку, Э. Ажэшкі ў Гродне і музей Т. Касцюшкі ў Мерачоўшчыне. У 1919 г. быў заснаваны музей прыроды ў Белавежскай Пушчы.

У 1929 г. у Слоніме быў адкрыты прыватны музей, створаны мясцовым краязнаўцам Іванам Стаброўскім. Музей мае арыгінальны будынак з цікавым вырашэннем галоўнага фасада ў выглядзе дзвюх вежаў-пілонаў па вуглах, што мае водгук у храмавай архітэктуры Старажытнага Егіпта.

У БССР да 1941 г. не было пабудавана ніводнага музейнага будынка. У 1923 г. у Мінску быў адкрыты першы мемарыяльны музей, прысвечаны І з'езду РСДРП, які згарэў у 1941 г. і быў зноў адноўлены, але ў іншым месцы ў 1948 г. як дакладная копія драўлянага дома Пятра Румянцава, дзе і адбываўся вышэйзгаданы з'езд. Пад музеі ў БССР прыстасоўваліся культавыя будынкі, а таксама розныя адміністратыўныя і былыя прыватныя будынкі, пабудаваныя да 1917 г.

Пасля Другой сусветнай вайны музейная справа ў БССР адраджалася даволі марудна. Новыя музейныя будынкі будаваліся ў асноўным у сталіцы. Гэта будынак Мастацкага музея – 1957 г., архітэктар М. І. Бакланаў, будынак Літаратурнага музея Янкі Купалы – 1959 г., будынак Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, архітэктары Г. Бенядзіктаў і Г. Заборскі – 1966 г.

Значная колькасць будынкаў, прыстасаваных пад музеі, з'явілася пасля 1968–1969 гг., калі былі створаны Спецыяльныя навукова-рэстаўрацыйныя вытворчыя майстэрні Міністэрства культуры БССР. Пад музеі пасля рэстаўрацыі прыстасоўваліся будынкі былых храмаў, напрыклад, Полацкая Сафія, Праабражэнская царква ў Заслаўі, касцёл у Раўбічах, былы Кальвінскі збор у Смаргоні, Каложская царква ў Гродне.

Некаторыя музеі планавалася адкрыць у замках. Гэта Мірскі, Нясвіжскі, Лідскі і Гродзенскі замкі. Ствараліся мемарыяльныя музеі і цэлыя мемарыяльныя комплексы, такія як Брэсцкая крэпасць і Хатынь, аднаўляліся будынкі, звязаныя з жыццём і дзейнасцю беларускіх дзеячаў культуры і мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Былі выпадкі і будаўніцтва новых музейных будынкаў у рэгіёнах. Так, у 1969 г. быў створаны школьны музей у СШ № 2 г. Клецка. Неўзабаве побач са школай сталі будаваць двухпавярховы будынак для музея, паводле спецыяльнага праекта. У якасці ўзору ўзялі адзін з будынкаў палацавага комплексу ў Гомелі. У верасні 1979 г. школьны музей пераехаў у новы будынак і атрымаў статус дзяржаўнага музея. Зараз ён мае назву «Музей гісторыі Клетчыны».

Цікавы будынак Музея народнай творчасці быў збудаваны ў 1984–1990 гг. у вёсцы Моталь Брэсцкай вобласці Іванаўскага раёна. Гэта прыгожы драўляны будынак, зроблены ў народных традыцыях пачатку XX ст.

Пасля 1988 г. у СССР змянілася палітыка ў адносінах да царквы і вернікам пачалі вяртаць забраныя храмы і кляштары. Гэтая тэндэнцыя ўзмацнілася і ў першыя гады беларускай незалежнасці. Многія музеі пераехалі ў іншыя будынкі, і ў храмах – былых музеях загучалі малітвы і казанні.

У якасці прыкладу разгледзім лёс Смаргонскага гісторыка-краязнаўчага музея. У 1984 г. Смаргонскі гісторыка-краязнаўчы музей размясціўся ў помніку архітэктуры XVI ст. – былым Кальвінскім зборы. У 1986 г. Міністэрства культуры вырашыла змяніць профіль музея і стварыць у Смаргоні адзіны ў рэспубліцы музей-тэатр «Батлейка». Праект прыстасавання будынка быў зменены. Праз некалькі месяцаў вырашылі замест «Батлейкі» зрабіць Музей народнага тэатра. Аднак у маі 1987 г. зноў вярнуліся да музея-тэатра «Батлейка». Адначасова экспазіцыю гісторыка-краязнаўчага музея вырашылі стварыць у будынку тагачаснага раённага Дома культуры. Але пазней і былы Кальвінскі збор, а потым і будынак РДК перадалі каталіцкай абшчыне.

Музей часова пераязджае на другі паверх толькі што пабудаванай крамы і доўгі час не мае ўласнай экспазіцыі, а памяшканне называецца «выставачная зала музея». У 1998 г. будынак перадаюць аддзелу культуры і пачынаецца яго рэканструкцыя пад музей. У 2005 г. быў зацверджаны праект будучай экспазіцыі, а будынак канчаткова набыў абрысы музея.

Вельмі цікавым фактам у музейным будаўніцтве Беларусі з'яўляецца стварэнне археалагічнага музея «Бярэсце», філіяла Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея, які быў заснаваны ў 1972 г., на Шпітальным востраве Брэсцкай крэпасці на месцы дзядзінца старажытнага горада Бярэсце. Над былым раскопам, дзе добра захаваліся рэшткі старажытных драўляных будынкаў, збудавалі музейны павільён з бетону, шкла і анадзіраванага алюмінію памерам 40х60 м.

Задумка архітэктараў была зрабіць будынак у выглядзе старажытнага жытла і пластоў зямлі, якія «адкрываюць» старажытны горад. У цэнтры музея знаходзіцца вялікі раскоп з закансерваванымі рэшткамі драўлянай забудовы, а па перыметры памяшкання размяшчаюцца 14 залаў-нішаў з музейнай экспазіцыяй. Будынак музея быў спраектаваны архітэктарам М. К. Вінаградавым, галоўным інжынерам А. М. Кімам, а таксама інстытутам «Белдзяржпраект».

Аднак стан экспанатаў у гэтым музеі, асабліва археалагічнага дрэва, нельга назваць добрым. Для музейных экспанатаў неабходны аптымальны рэжым вільготнасці і тэмпературы, патрабуе аднаўлення сістэма вентыляцыі і ацяплення. З гэтай прычыны кожную зіму значная частка экспанатаў перавозіцца ў сховішча абласнога краязнаўчага музея. Рамонт павільёна доўжыцца шмат гадоў, але з-за недахопу сродкаў ідзе марудна. Да таго ж «"даюцца ў знакі" грунтавыя воды, якія трэба ўвесь час адпампоўваць» [3].

Яшчэ адзін археалагічны музей дзякуючы намаганням П. Ф. Лысенкі збудаваны ў 2005–2006 гг. у гістарычным цэнтры старажытнага Турава. Музейны павільён утрымлівае падмуркі Тураўскага храма другой паловы XII ст. [1]. У жніўні 2006 г. у музеі была ўрачыста адкрытая музейная экспазіцыя «Замкавая гара» [2].

Шмат гадоў будаваўся будынак Мінскага абласнога краязнаўчага музея. Увесь гэты час музей знаходзіўся ў невялічкім драўляным будынку з экспазіцыйнай плошчай усяго 270 кв. м. Частка супрацоўнікаў музея і яго фондаў размяшчалася ў бібліятэцы. Будаўніцтва сталага музейнага будынка пачалося ў сярэдзіне 1980-х гг. і доўжылася аж да 2006 г. Плошча экспазіцыйных і выставачных памяшканняў павялічылася да 450 кв. м [7]. Будынак музея зроблены ў стылі неаканструктывізму і мае ўдалае спалучэнне карычневай і жоўтай афарбоўкі верхняга і ніжняга паверхаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1992 г. быў адкрыты для наведвальнікаў будынак двухпавярховага музейна-выставачнага комплексу ў г. Заслаў'і Мінскага раёна. У 1994 г. збудаваны музейны будынак для Любанскага дзяржаўнага музея народнай славы агульнай плошчай 162 кв. м. Гэта аднапавярховы будынак з выступаючым рызалітам-уваходам. У гэтым, 2012 г., мяркуюць адкрыць Музей гісторыі дарог і паштовай службы ў Старых Дарогах. Будынак аднапавярховы, выцягнуты ўздоўж чыгункі, мае тры залы для розных экспазіцый.

З вышэйзгаданага вынікае, што ў нашай краіне няма тыпавых праектаў рэгіянальных музейных будынкаў, а будаўніцтва новых музеяў – справа хутчэй выпадковая, чым планавая. Прычым некаторыя музеі ці прыбудовы да іх будаваліся дзясяткі гадоў. Асобная тэма – гэта спроба збудаваць новы будынак для галоўнага музея Беларусі – Дзяржаўнага музея БССР.

Камітэт па справах культурна-асветніцкіх устаноў шмат разоў пачынаючы з сярэдзіны 1940-х гг. звяртаўся ў Савет Міністраў БССР з прапановай адкрыць у Мінску Беларускі дзяржаўны музей. Гэтую прапанову падтрымала Акадэмія навук БССР, але ўлады штогод адхілялі гэтую ідэю і казалі, што грошай на будаўніцтва музейнага будынка ў цэнтры Мінска няма.

Нарэшце, 7 лістапада 1964 г. ЦК КПБ прыняў пастанову аб адкрыцці ў Мінску Дзяржаўнага музея БССР. На гэты час у яго фондах ужо было 120 тыс. музейных экспанатаў. Каля Палаца прафсаюзаў будаваўся музейны будынак па адрасе – праспект Леніна, 25а. Аўтары праекта – архітэктары Г. Бенядзіктаў і Г. Заборскі. 12 лістапада музейшчыкі атрымалі ключы ад новага будынка і разгарнулі ў ім юбілейную выставу «900 гадоў Мінску». Аднак праз год, у лістападзе 1965 г. ЦК КПБ раптоўна высяляе музей з новага будынка ў значна меншае (у тры разы!) па плошчы памяшканне. Гэта быў будынак былога дарэвалюцыйнага банка, па вуліцы К. Маркса, 12. Афіцыйнае адкрыццё музея адбылося 2 лістапада 1967 г. [5].

У новы будынак пераехаў Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, які спачатку быў у тым памяшканні, куды раптоўна перасяліўся Беларускі дзяржаўны музей. Зараз для гэтага музея будуюць новае памяшканне. Будаўніцтва пачалося ў красавіку 2010 г., галоўны архітэктар праекта – Віктар Крамарэнка. Будынак задуманы як сімвалічны «архітэктурны салют Перамогі». У якасці даху задуманы вялікі шкляны купал. Плошча будучага музея 15 тыс. кв. м. Побач плануюць зрабіць «Плошчу герояў» з адмысловым фантанам. Мяркуюць адкрыць новы музей 9 мая 2014 г.

Але галоўнаму музею краіны, які зараз мае назву Нацыянальны гістарычны музей, пакуль не шанцуе. Сёння мы не маем спецыяльнага будынка гістарычнага музея, у якім можна было б расказаць пра гераічную гісторыю беларускага народа. І калі будынак Нацыянальнай бібліятэкі прыцягвае ўвагу шматлікіх гасцей нашай сталіцы, то пра будынак гістарычнага музея, былы банк, такога не скажаш.

Для размяшчэння фондавых калекцый музея неабходны будынак плошчай не менш чым 3,5 тыс. кв. м. З гэтага трэба зыходзіць пры праектаванні і пабудове новага музейнага будынка, які павінен стаць сімвалам тысячагадовай беларускай гісторыі – гісторыі нашай дзяржаўнасці.

Было б добра, каб па заказе Міністэрства культуры архітэктары распрацавалі некалькі тыпавых праектаў рэгіянальных музеяў рознага профілю, асабліва мастацкіх і краязнаўчых. У 2000 г. галоўны спецыяліст аддзела музеяў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Сяргей Вечар (зараз ён дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея) вызначыў неабходныя ўмовы для стварэння рэгіянальнага музея: «існаванне рухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей, у адпаведнасці з якімі вызначаецца тэматыка музея; наяўнасць будынка, пажадана помніка архітэктуры і ў цэнтры горада. Будынак музея мусіць быць прыстойны. Каб мелася месца пад размяшчэнне фондаў, каб былі памяшканні для лекцыйнай і выставачнай залаў. Бо бывае, што адводзяць пад музей якую старую хаціну ці былы дзіцячы садок» [8].

Зараз да музейнага будынка спецыялісты прад'яўляюць пэўныя эстэтычныя патрабаванні. Яны лічаць, што для лепшай камунікацыі з наведвальнікамі музея маюць вялікае значэнне не толькі функцыянальныя характарыстыкі музейнага будынка, але і яго эстэтычны выгляд. Зараз музей успрымаецца як адзіны візуальны комплекс і таму мастацкі вобраз яго будынка мае асаблівую ролю ў працэсе ўзаемадзеяння наведвальніка музея і музейнай прасторы. Архітэктура музея якраз стварае гэтую непаўторную прастору.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распрацоўка і зацвярджэнне некалькіх тыпавых праектаў рэгіянальных музейных будынкаў можа палепшыць не толькі эстэтыку знешняга выгляду музеяў, але і ўмовы захавання музейнага фонду.


1. *Археалогія* Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2011. – Т. 2. – С. 355.

2. *Берасцень, С.* Вяртанне ў вераснёвы Тураў / С. Берасцень // ЛіМ. – 2006. – 25 жн. (№ 34). – С. 11.

3. *Бугаёва, Г. У.* Археалагічнаму музею «Бярэсце» – 25 гадоў / Г. У. Бугаёва // Наша слова. – 2008. – 16 крас. (№ 16).

4. *Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2001. – 124 с.

5. *Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1941–1991) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2004. – С. 67.

6. *Ешин, С. З.* Развитие культуры в БССР за годы Советской власти / С. З. Ешин. – Минск : Полымя, 1970. – С. 65.

7. *Лянкевіч, Т.* Мінскі абласны краязнаўчы музей / Т. Лянкевіч. – Мінск : Беларускі гістарычны часопіс. – 2001. – № 6. – С. 33.

8. *Мануйлаў, К.* Заўсёдныя папялушкі Мінфіна / К. Мануйлаў // Свабода. – 2000. – 20 чэрв. – С. 33.

9. *Музеі Беларусі :* давед. выд. – Мінск : БелЭн, 2008. – С. 53.

10. *Полацк* музейны : фотаальбом. – Мінск : Беларусь, 2006. – 281 с.

11. *Чугунова, А. В.* Музейная архитектура в контексте современной культуры / А. В. Чугунова // Вопросы музеологии. – 2010. – № 1. – С. 35–37.


*A. TRUSAU*

**THE AESTHETICS OF THE REGIONAL MUSEUMS' RCHITECTURE**

A considerable part of the belarusian museums are situated in the buildings, which from the very beginning had quite non-museum functions. Though, from the beginning of the XVIII century special museum buildings have been built. The analysis of the museum buildings' aesthetics of various years confirms that there are no typical projects of the regional museum buildings in our country. Their visual environment has an accidental character. The author offers to work out and assert some typical projects of the regional museum buildings, especially for the local history and art museums.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 21.03.2012.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ